КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
________________ У. У. Шлыкаў
________________ 2015 г.
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-27-01/р

# ГІСТОРЫЯ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей профіля А – педагогіка**

Факультэт гістарычны
Кафедра гісторыі Беларусі і славянскіх народаў

Курс у адпаведнасці з вучэбнымі планамі факультэтаў

Семестр у адпаведнасці з вучэбнымі планамі факультэтаў

Лекцыі 22 гадзіны

Практычныя (семінарскія)
заняткі 12 гадзін

Залік +

Аўдыторных гадзін па
вучэбнай дысцыпліне 34

Усяго гадзін
па вучэбнай дысцыпліне 72

Форма атрымання вышэйшай
адукацыі дзённая, завочная

Складальнік: П.А.Мацюш, кандыдат гістарычных навук

2015 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбная праграма складзена на аснове вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі “Гісторыя грамадскай думкі” № УД-27-01/баз. №25/2015 ад 30.04.2015 г.

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў

08.05.2015, № 7
(дата, номер пратакола)

Загадчык кафедры
________________А.Ф.Вялікі
(подпіс)

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння Саветам гістарычнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

26.05.2015, № 10
(дата, номер пратакола)

Старшыня
________________А.В.Касовіч
(подпіс)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючыя яе матэрыялы дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядаюць.

Метадыст вучэбна-метадычнага
ўпраўлення БДПУ ________________Г.І.Шкнай

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Грамадская думка Беларусі фарміравалася на працягу стагодзяў. У аснове любога палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага факта ляжыць тая ці іншая ідэя, якая паступова дабівалася агульнага прызнання, станавілася карыснай для грамадства, выступала ў якасці маральнага імператыву. Яна рэгулявала паводзіны асоб, розных груп, суполак, сацыяльных інстытутаў у грамадстве, выпрацоўвала пэўныя нормы грамадскага жыцця.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя грамадскай думкі Беларусі” павінна дапамагчы студэнтам асэнсаваць адметнасці грамадскага развіцця Беларусі, засвоіць духоўныя каштоўнасці беларускага грамадства, паказаць ролю асобы ў гісторыі, паглыбіць агульнагістарычныя веды.

**Мэта** – сфарміраваць цэласнае прадстаўленне аб сутнасці і эвалюцыі грамадскага развіцця Беларусі.

Для дасягнення пастаўленай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных **задач:**

- выявіць месца гісторыі грамадскай думкі Беларусі ў сістэме агульнаадукацыйных дысцыплін;
- прааналізаваць працэс станаўлення і развіцця грамадскай думкі Беларусі ў цеснай сувязі з гісторыяй нацыянальнай культуры і фарміраваннем этнічнага аблічча беларускага народа на агульнаеўрапейскім фоне;
- азнаёміць з жыццём, дзейнасцю і духоўнай спадчынай выдатных дзеячаў гісторыі, навукі, культуры, палітыкі Беларусі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінн **ведаць:**

- асноўныя паняцці і тэрміны вывучаемай дысцыпліны;
- перыядызацыю развіцця грамадскай думкі Беларусі;
- выдатных палітычных, рэлігійных, навуковых, культурных дзеячаў беларускай гісторыі;
- асноўныя ідэі, тэорыі, канцэпцыі, якія ўзбагацілі духоўную спадчыну беларускага народа;

**умець:**

- характарызаваць асноўныя этапы развіцця грамадскай думкі Беларусі;
- разумець і тлумачыць асноўныя ідэі, тэорыі, канцэпцыі, выпрацаваныя беларускімі асветнікамі, філосафамі, навукоўцамі, грамадскімі, палітычнымі і рэлігійнымі дзеячамі;
- ацэньваць асноўныя дасягненні грамадска-палітычнай, прававой, філасофскай думкі Беларусі;
- выяўляць сувязь Беларусі з грамадска-палітычнымі і культурнымі працэсамі ў свеце;
- выкарыстоўваць гістарычны вопыт для аналізу сучасных тэндэнцый грамадскага развіцця Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**валодаць:**

- асноўнымі паняццямі ў галіне грамадскай думкі ва ўзаемасувязі з гісторыяй Беларусі;
- навыкамі работы з навуковай, навукова-папулярнай і мастацкай літаратурай падчас падрыхтоўкі да лекцыйных і практычных заняткаў;
- метадамі інтэрпрэтацыі з'яў і фактаў гісторыі Беларусі.

Выкладанне курса "Гісторыя грамадскай думкі Беларусі" непасрэдна звязана з вывучэннем інтэграванага модуля "Гісторыя", што істотна дапаўняе і паглябляе яго змест.

Вынікі вывучэння дысцыпліны ажыццяўляюцца праз розныя формы кантролю: апытанні, рэфераты, тэставыя заданні, залік.

Вучэбная дысцыпліна "Гісторыя грамадскай думкі Беларусі" вывучаецца ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі факультэтаў і прадугледжвае ўсяго 72 гадзіны, у тым ліку 34 аўдыторных (з із 22 гадзін – лекцыйных, 14 – практычных (семінарскіх) заняткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Тэма | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Аўдыторных | | |
| | | Усяго | Лекцыі | Семінары |
| **1.** | Увоздіны ў курс “Гісторыя грамадскай думкі Беларусі” | 2 | 2 | |
| **2.** | Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці. Уплыў хрысціянства на генезіс грамадска-палітычнай думкі старажытнай Беларусі. | 2 | 2 | |
| **3.** | Грамадска-палітычная думка ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі. | 4 | 2 | 2 |
| **4.** | Палітычная і прававая думка ў перыяд Контррэфармацыі і панавання клерыкальнай ідэалогіі | 4 | 2 | 2 |
| **5.** | Асветніцкія ідэі і іх уплыў на грамадска-палітычнае жыццё у Беларусі | 2 | 2 | |
| **6.** | Грамадска-палітычная думка ў першай палове XIX ст. | 4 | 2 | 2 |
| **7.** | Актывізацыя грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі ў другой палове XIX-пачатку XX стст. | 4 | 2 | 2 |
| **8.** | Беларускі нацыянальны рух у перыяд абвяшчэння і стварэння беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.) | 2 | 2 | |
| **9.** | Грамадска-палітычная думка ў Беларусі ў 1920–1930-я гг. | 4 | 2 | 2 |
| **10.** | Асаблівасці грамадскага жыцця ў пасляваенны перыяд. (1945 – 1990 гг.) | 2 | 2 | |
| **11.** | Грамадска-палітычнае развіццё Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Станаўленне новых духоўных каштоўнасцей у грамадстве. | 4 | 2 | 2 |
| | **УСЯГО:** | **34** | **22** | **12** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

**Тэма 1. Увоздіны ў курс “Гісторыя грамадскай думкі Беларусі”**

Агульная характарыстыка “Гісторыі грамадскай думкі Беларусі” як вучэбнай дысцыпліны. Гістарыяграфія і крыніцы курса. Перыядызацыя гісторыі грамадскай думкі Беларусі.

**Тэма 2. Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці. Уплыў хрысціянства на генезіс грамадска-палітычнай думкі старажытнай Беларусі.**

Станаўленне ранніх дзяржаўных утварэнняў усходніх славян на тэрыторыі Беларусі. Кіеўская Русь і яе роля ў гісторыі ўсходнеславянскіх народаў. Полацкае і Тураўскае княствы. Грамадска-палітычныя ідэі “Слова пра паход Ігаравы” і “Аповесці мінулых часоў”. Летапісанне. Асноўныя рысы старажытнага права Беларусі.

Прычыны і гістарычныя ўмовы распаўсюджвання хрысціянства ва ўсходнеславянскіх землях. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы і іх роля ў распаўсюджванні хрысціянскай маралі. Е. Полацкая. К. Смаляціч. К. Тураўскі.

**Тэма 3. Грамадска-палітычная думка ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі**

Асаблівасці развіцця грамадска-палітычных працэсаў у ВКЛ. Адлюстраванне грамадска-палітычнай рэчаіснасці ў беларуска-літоўскіх летапісах.

Характарыстыка грамадска-палітычнага і духоўнага жыцця Еўропы ў Новы час. Распаўсюджванне гуманістычных ідэй. Асноўныя тэндэнцыі развіцця грамадска-палітычнай думкі ў эпоху Адраджэння, Рэфармацыі. Уплыў розных рэфармацыйных плыняў на развіццё грамадскай думкі ВКЛ. Распаўсюджванне лютэранства, кальвінізму (памяркоўныя і радыкальныя напрамкі).

Статуты ВКЛ і іх уплыў на фарміраванне ўсходнеславянскай і еўрапейскай грамадска-прававой культуры. Л. Сапега.

Шляхецкая ідэалогія і яе роля ў палітычнай кансалідацыі прывілеяваных саслоўяў. Асаблівасці беларускага Адраджэння, яго каштоўнасці і ідэалы (XVI - пачатку XVII стст.) Асветніцкі напрамак грамадска-палітычнай думкі беларускага Адраджэння. Погляды Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С. Буднага, В. Цяпінскага.

**Тэма 4. Палітычная і прававая думка ў перыяд Контррэфармацыі і панавання клерыкальнай ідэалогіі**

Пачатак Контррэфармацыі. Дзейнасць езуітаў. Берасцейская царкоўная унія. Барацьба ідэалагічных напрамкаў. Погляды П. Скаргі, І. Пацея, С. Зізанія, М. Сматрыцкага, і інш.

Дзейнасць І. Кунцэвіча. Сацыяльна-філасоўскія погляды К. Лышчынскага. С. Полацкі – тэарэтык асветнага абсалютызму ў Расіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Грамадска-палітычныя погляды І. Капіевіча, А. Філіповіча. Пачатак вышэйшай юрыдычнай адукацыі ў Беларусі.

**Тэма 5. Асветніцкія ідэі і іх уплыў на грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі**

Гістарычныя ўмовы развіцця Асветніцтва ў другой палове XVIII ст. Прадвеснікі асветніцкай ідэалогіі С. Ляшчынскі, С. Канарскі. Уплыў еўрапейскіх асветнікаў на фарміраванне грамадска-палітычнай думкі на беларускіх землях. Вальтэр. Руссо і інш.

Палітычная думка эпохі Асветніцтва. Дысідэнцкі рух. Палітычныя погляды Г. Канісскага, І. Страйноўскі, І. Храптовіч. Грамадска-палітычныя ідэі А. Тызенгаўза. Асноўныя ідэі Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г. Грамадская ацэнка падзелаў Рэчы Паспалітай.

**Тэма 6. Грамадска-палітычная думка ў першай палове XIX ст.**

Спецыфіка развіцця грамадска-палітычнай думкі ў пачатку XIX ст. Віленскі ўніверсітэт як цэнтр вольнадумства. Першыя праяўленні беларускай нацыянальнай ідэі ў мастацкай літаратуры. Развіццё навуковых ведаў аб беларускім народзе. Рост грамадзянскай свядомасці. Тайныя таварыствы і арганізацыі. Філарэты. Філаматы. Т. Зан, А. Міцкевіч, Я. Чачот. Роля дзекабрыстаў у актывізацыі грамадскага жыцця. М. Мураўёў.

Рэвалюцыйныя падзеі ў Заходняй Еўропе і іх уплыў на грамадска-палітычнае жыццё Беларусі. Ф. Савіч.

**Тэма 7. Актывізацыя грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі ў другой палове XIX-пачатку XX стст.**

Адмена прыгоннага права. Буржуазныя рэформы 60–70-х гг. XIX ст.: асаблівасці іх правядзення ў Беларусі. Паўстанне 1863–1864 гг. і яго ўплыў на палітыку ўладаў Расійскай імперыі ў беларускіх губернях. Палітычыя ідэі К. Каліноўскага.

Ідэалогія лібералізму, народніцкі і сацыял-дэмакратычны рухі ў Беларусі. Пазіцыя гомазаўцаў. Гістарычныя ўмовы фарміравання беларускай нацыі. Афармленне агульнарасійскіх палітычных партый і іх роля ў фарміраванні грамадска-палітычнай думкі. Беларускі нацыянальны рух і яго роля ў рэвалюцыйным працэсе ў пачатку XX ст. БСГ. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. Пачатак парламентарызму. Роля “Нашай Нівы” (1906-1910) у абуджэнні гістарычнай свядомасці беларускага народа. Дзейнасць палітычных партый і рухаў (БУНД, РСДРП, ПСР і інш.).

**Тэма 8. Беларускі нацыянальны рух у перыяд абвяшчэння і стварэння беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.)**

Праблема гістарычнага выбару пасля падзення ў Расіі самадзяржаў’я. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. і падзеі ў Беларусі. Стратэгія і тактыка палітычных партый у адносінах да ўлады і выбар шляхоў грамадскага развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Роля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў гістарычным лёсе беларускага народа. Устанаўленне Савецкай улады ў Беларусі. Першы Усебеларускі з’езд.

Шляхі фарміравання беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай і рэвалюцыйна-класавай асновах. Пазіцыя бальшавікоў у нацыянальным пытанні. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці.

**Тэма 9. Грамадска-палітычная думка ў Беларусі ў 1920–1930-я гг.**

Асноўныя характарыстыкі савецкага грамадска-палітычнага жыцця. Станаўленне і развіццё савецкай ідэалагічнай сістэмы. Разгром палітычнай апазіцыі ў пачатку 1920-х гг. завяршэнне фарміравання аднапартыйнай сістэмы. Замацаванне манаполіі камуністычнай партыі. Усталяванне ідэалагічнай артадоксіі.

Канстытуцыя БССР 1927 г. Дасягненні ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Беларусізацыя як частка нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі. Унутрыпартыйная барацьба ў БССР (1920-я гг.). Разгром беларускага нацыянал-дэмакратызму. Змены ў савецкай дзяржаўнай сістэме і іх адлюстраванне ў Канстытуцыі БССР 1937 г. Асноўныя характарыстыкі грамадскай сістэмы ў БССР (1920–1930-я гг).

Рыжскі мірны дагавор у гістарычным лёсе беларускага народа. Грамадска-палітычнае, эканамічнае, нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух ў Заходняй Беларусі.

**Тэма 10. Асаблівасці грамадскага жыцця ў пасляваенны перыяд. (1945 – 1990 гг.)**

Новая растаноўка палітычных сіл у Свеце пасля Другой Сусветнай вайны. Супрацьборства двух сацыяльна-палітычных сістэм.

Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Барацьба з антысавецкімі ваеннымі арганізацыямі і групамі. Ідэалагічныя кампаніі і неабгрунтаваныя рэпрэсіі па палітычных матывах другой палове 1940-х – 1953 гг. Асуджэнне культа асобы І.В. Сталіна. Асаблівасці працэсу дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1950-х – 1964 гг. Нарастанне кансерватызму ў грамадска-палітычным жыцці ў 1970-я – першай палове 1980-х гг. Бюракратызацыя партыйна-дзяржаўнага апарату. Узмацненне фармалізацыі ў жыцці і дзейнасці грамадскіх арганізацый. Спробы рэфармавання палітычнай сістэмы ў гады перабудовы. Нефармальныя грамадскія арганізацыі, пачатак пераходу да шматпартыйнасці. Змены выбарчай сістэмы. Выбары З’езда народных дэпутатаў СССР, выбары Вярхоўнага Савета БССР XII склікання. Грамадска-палітычныя канфлікты ў саюзных рэспубліках. “Парад суверэнітэтаў”. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 11. Грамадска-палітычнае развіццё Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Станаўленне новых духоўных каштоўнасцей ў грамадстве.**

Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Беларускі парламентарызм ва ўмовах шматпартыйнасці. Савет Міністраў у сістэме дзяржаўнай улады. Фарміраванне незалежнай судовай улады. Канстытуцыйны працэс і прыняцце Канстытуцыі 1994 г. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і фарміраванне новай сістэмы ўлады. Палітычная барацьба і рэспубліканскі рэферэндум 1995 г. Канстытуцыйны крызіс і рэферэндум 1996 г., яго вынікі. Пераход да прэзідэнцкай рэспублікі.

Міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Станаўленне нацыянальнай дыпламатыі. Выпрацоўка стратэгіі і прынцыпаў знешняй палітыкі. Эканамічны прагматызм як фактар знешняй палітыкі. Шматвектарнасць знешняй палітыкі.

Стан гісторыка-культурнай спадчыны. Асноўныя накірункі развіцця літаратуры і мастацтва. Узаемаадносіны дзяржавы і царквы, адраджэнне рэлігійна-канфесійнага жыцця.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Пералік асноўнай і дадатковай літаратуры

*Асноўная:*

1. Батяев, В.Ф. Развитие белорусских общественных обьединений в XIX – 20-е годы XX века / В.Ф. Батяев. Ин-т искусствоведения. этнографии и фольклора им. К.Крапивы НАН Беларуси. – Минск: Право и экономика, 2007. – 381 с.

2. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш. навуч.установ/ І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей, 2004. – 272 с.

3. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пачатак XXI ст.): манаграфія / І.У. Вішнеўская. – Мінск, 2008. – 296 с.

4. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т. Т. 1. Эпоха Сярэднявечча / В. Б. Евароўскі [і інш.]; рэд. кал.: В.Б. Евароўскі [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 980 с.

5. Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т.І. Доўнар. – Мінск: Амалфея, 2007. – 400 с.

6. Забаўскі, М.М. Расійская Дзяржаўная Дума ў лёсах Беларусі (1906–1917 гг.) / М.М. Забаўскі. – Мінск: БДПУ, 2008. – 266 с.

7. Козел, А.А. Философская мысль Беларуси: учеб. пособие / А.А. Козел. – Минск: Амалфея, 2004. – 352 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

8. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: НКФ Экаперспектыва, 1996. – 453 с.

9. Мохнач, Н.Н. Общественно-политическая и этическая мысль Белоруссии начала XIX в. / Н.Н. Мохнач. Мн.. 1995. – 170 с.

10. Падокшын, С.А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI–XVII стст. / С.А. Падокшын; навук. рэд. А.С. Майхровіч. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 151 с.

11. Падокшын, С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз) / С.А.Падокшын. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 111 с.

12. Саверчанка, І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэння і Ранняе барока / І. Саверчанка. – Мінск: Тэхналогія, 1998. – 319 с.

13. Сокал, С.Ф. Кароткі агляд палітычнай і прававой думкі Беларусі: лекцыйны матэрыял / С.Ф. Сокал. – Магілёў, 1999. – 142 с.

14. Чыгрынаў, П.Г. Грамадская думка ў Беларусі: палітыка-гістарычны аспект (X – пачатак XX ст.): вуч. дапаможнік / П.Г. Чыгрынаў. – Мінск, 1996.

15. Шалькевіч, В. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В. Шалькевіч. – Мінск: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002. – 248 с.

***Дадатковая:***

1. Бегунов, Ю.К. К вопросу о церковно-политических планах Григория Цамблака / Ю.К. Бегунов // Советское славяноведение. – 1981. – № 3.

2. Бич, М.И. Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1904 гг. – Мінск, 1983.

3. Блинова, Т.Б. Иезуиты в Белоруссии. Роль иезуитов в организации образования и просвещения / Т.Б. Блинова. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 425 с.

4. Васілевіч, Р.А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі / Р.А. Васілевіч, Т.І. Доўнар, І.А. Юхо. – Мінск: Права і эканоміка, 2001. – 362 с.

5. Галенчанка, Г.Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г. Галенчанка. – Мінск, 1993.

6. Дзербіна, Г.В. Узаемаўплывы прававой культуры Вялікага княства Літоўскага і Польшчы ў XVI ст. / Г.В. Дзербіна // На шляхах да ўзаемаразумення (Беларусіка = Albaruthenika. Кн.15). – Мінск, 2000.

7. Іванова, Л. Са спадчыны Сымона Буднага / Л. Іванова // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1986. – № 4.

8. Конан, У.М. Ф. Скарына і яго героі // Адраджэнне. Гістарычны альманах. Вып. 1. – Мінск, 1995.

9. Кохановский, А.Г. Белорусская интеллигенция: самоопределение и этапы становления в XIX — начале XX в / А.Г. Кохановский // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У.К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мінск: БДУ, 2007. – С. 3–20.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Кузьма, Д.І. Праекты першых беларускіх універсітэтаў: М.В. Каяловіч і праблема арганізацыі праваслаўнай вышэйшай навучальнай установы ў Беларусі ў другой палове XIX ст. / Д.І. Кузьма // Беларуская думка. – 2010. – № 6. – С. 116–120.

11. Ладысеў, У.Ф. На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917–1939 гг.) / У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін. – Мінск, 2003.

12. Майхрович, А.С. Становление и развитие философской мысли в X – XVIIIвв. / А.С. Майхрович // Очерки истории науки и культуры Беларуси / А.С. Майхрович, С.А. Подокшин. – Мн.: Навука і тэхніка, 1996. – С. 202-223.

13. Мальдзіс, А.І. Францыск Скарына як прыхільнік збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў / А.І. Мальдзіс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 34 с.

14. Мартос, А. Літоўска-Новагародская мітраполія / А. Мартос // Спадчына. – 1992. – № 6; 1993. – № 1.

15. Мельнікаў, А.А. Кірыл, епіскап Тураўскі, Жыццё. Спадчына. Светапогляд / А.А. Мельнікаў. – Мінск, 2000.

16. Мельнікаў, А. «Жыціе» і жіцце Еўфрасінні ігуменні Полацкай // Адраджэнне. Гістарычны альманах. – Вып. 1. – Мінск, 1995.

17. Мохнач, Н.Н. От Просвещения к революционному демократизму (Общественно-политическая и философская мысль Белоруссии конца 10-х – начала 50-х годов XIX в.). – Мінск, 1978.

18. Платонаў, Р. Палітыкі. Ідэі. Лёсы. Грамадзянская пазіцыя ва ўмовах нарастання ідэалагічна-палітычнага дыктату ў Беларусі 20–30-х гг. / Р. Платонаў. – Мінск,1996.

19. Саверчанка, І.В. Канцлер Вялікага княства Леў Сапега / І. Саверчанка. – Мінск, 1992.

20. Саверчанка, І.В. Сымон Будны: Гуманіст і рэфарматар / І. Саверчанка. – Мінск, 1993.

21. Самбук, С.М. Общественно-политическая мысль Белоруссии во 2-й половине XIX в. / С.М. Самбук – Мінск, 1976.

22. Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во 2-й пол. XIX в. / С.М. Самбук – Мінск, 1982.

23. Сідарэвіч, А. Антон Луцкевіч і гісторыя беларускага руху / А. Сідарэвіч // Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы. – Мінск, 2003.

24. Спірыдонаў, М.Ф. Апошні канцлер Вялікага Княства Літоўскага [Яўхім Храптовіч] // Спадчына. – 2001. – № 1–2.

25. Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.). – Мінск: Кнігазбор, 2008. – 608 с.

26. Старостина, И.П. Право ВКЛ в контексте культурно-исторических связей Польши, Литвы и Руси // Восточная Европа в исторической ретроспективе. – М., 1999.

27. Терешкович, П.В. Из истории формирования национального самосознания белорусов (XIV – начало XX в.) / П.В. Терешкович // Советская этнография. – 1990. – № 6. – С. 8-26.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

28. Турук, Ф.Ф. Белорусское движение / Ф.Ф. Турук. – М.: Госиздат, 1921. – 143 с.

29. Шалькевіч В.Ф. Палітычныя погляды Міколы Гусоўскага (да 475-годдзя выхаду у свет паэмы «Песня пра зубра») / В.Ф. Шалькевіч // БГЧ. – 1998. – № 4.

30. Францыск Скарына. Зборнік дакументаў і матэрыялаў / АН БССР, Ін-т гісторыі; навук. рэд. Г.Я. Галенчанка. – Мінск, 1988. – 325 с.

31. Франциск Скорина и его время / Бел. сов. энцикл.; редкол.: Г.Я. Голенченко [и др.]. – Минск: БСЭ им. П.Бровки, 1990. – 631 с.

32. Швед, В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863) / В.В. Швед. – Гродна, 2001.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННЮ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “ГІСТОРЫЯ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ”

Мэтай метадычных рэкамендацый з’яўляецца павышэнне эфектыўнасці вучэбнага працэсу, у тым ліку дзякуючы самастойнай рабоце, у якой студэнт становіцца актыўным суб’ектам навучання, што азначае:

- здольнасць займаць у навучанні актыўную пазіцыю;
- магчымасць мабілізаваць інтэлектуальныя і валявыя намаганні для дасягнення вучэбных мэтаў;
- уменне праектаваць, планаваць і прагназаваць вучэбную дзейнасць;
- звычку ініцыяваць сваю пазнавальную дзейнасць на аснове ўнутранай станоўчай матывацыі;
- усведамленне сваіх патэнцыяльных вучэбных магчымасцяей і псіхалагічную падрыхтаванасць скласці праграму дзейнасці па самаразвіццю.

## Віды самастойнай работы студэнтаў

| | |
|---|---|
| *Рэпрадуктыўная самастойная работа* | Самастойнае азнаямленне, прагляд, канспектаванне вучэбнай літаратуры, праслухоўванне лекцый, завучванне, пераказ, запамінанне, інтэрнэт-рэсурсы, паўтарэнне вучэбнага матэрыялу |
| *Пазнавальна-пошуквая самастойная работа* | Падрыхтоўка паведамленняў, дакладаў, выступленняў на семінарскіх і практычных занятках, падбор літаратуры па праблемах дысцыпліны, напісанне рэфератаў, кантрольных, курсавых работ і інш. |
| *Творчая самастойная работа* | Падрыхтоўка тэзісаў і навуковых артыкулаў, удзел у навукова-даследчай рабоце, падрыхтоўка дыпломнай работы (праекта), удзел у студэнцкай навуковай канферэнцыі, студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі |

## Арганізацыя кантролю самастойнай работы

Для паспяховага выканання самастойнай работы студэнтаў неабходна планаванне і кантроль з боку выкладчыкаў. Аўдыторная самастойная работа выконваецца студэнтамі на лекцыях, семінарскіх занятках, таму выкладчык павінен загадзя пабудаваць сістэму самастойнай работы з улікам яе форм, мэты, адбіраючы вучэбную і навуковую інфармацыю і сродкі камунікацый, прадумваючы ролю студэнта ў гэтым працэсе і свой удзел у ім.

Пытанні для самастойнай працы студэнтаў, названыя ў рабочай праграме дысцыпліны, прапануюцца выкладчыкамі ў пачатку вывучэння дысцыпліны.

**Змест дзейнасці выкладчыка і студэнта пры выкананні самастойнай работы**

| Асноўныя характарыстыкі | Дзейнасць выкладчыка | Дзейнасць студэнтаў |
|---|---|---|
| Мэта выканання СР | -тлумачыць мэту і сэнс выканання СР;<br>-дае разгорнуты інструктаж аб патрабаваннях, прад'яўляемых да СР і спосабах яе выканання;<br>-дэманструе ўзор СР | -разумее і прымае мэту СР як асобасна значную;<br>-знаёміцца з патрабаваннямі да СР |
| Матывацыя | -раскрывае тэарэтычную і практычную значнасць выканання СР, тым самым фарміруе ў студэнта пазнавальную патрэбу і гатоўнасць да выканання СР;<br>матывуе студэнта на дасягненне поспеху | -фарміруе ўласную пазнавальную патрэбу у выкананні СР;<br>-фарміруе ўстаноўку і прымае рашэнне аб выкананні СР |
| Кіраванне | -ажыццяўляе кіраванне шляхам мэтанакіраванага ўздзеяння на працэс выканання СР;<br>-дае агульныя арыенціры выканання СР | -на аснове валодання абагульненым прыёмам сам ажыццяўляе кіраванне СР (праектуе, плануе, рацыянальна размяркоўвае час і г.д.) |
| Кантроль і карэкцыя выканання | -ажыццяўляе папярэдні кантроль, які прадугледжвае выяўленне зыходнага ўзроўню гатоўнасці студэнта да выканання СР;<br>-ажыццяўляе выніковы кантроль канчатковага выніку выканання СР | -ажыццяўляе бягучы аперацыйны самакантроль за ходам выканання СР;<br>-выяўляе, аналізуе і выпраўляе дапушчаныя памылкі, уносіць карэктывы ў работу, адсочвае ход выканання СР;<br>-вядзе пошук аптымальных спосабаў выканання СР;<br>-ажыццяўляе рэфлексіўнае стаўленне да ўласнай дзейнасці; |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | |
|---|---|---|
| | | -ажыццяўляе выніковы самакантроль выніку СР |
| Ацэнка | -на аснове параўнання выніку з узорам, загадзя зададзенымі крытэрамі дае ацэнку СР;<br>-выяўляе тыповыя памылкі, падкрэслівае станоўчыя і адмоўныя бакі, дае метадычныя парады па выкананні СР, намячае далейшыя шляхі выканання СР;<br>-устанаўлівае ўзровень і вызначае прагрэс студэнта, фарміруе ў яго матывацыю дасягнення поспеху ў вучэбнай дзейнасці | -на аснове суаднясення выніка з мэтай дае самаацэнку СР, сваім пазнавальным магчымасцям, здольнасцям і якасцям |

*Пазааўдыторная самастойная работа студэнтаў* (далей самастойная праца) - планаваная вучэбная, вучэбна-даследчая, навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў, якая ажыццяўляецца ў пазааўдыторны час па заданні і пры метадычным кіраўніцтве выкладчыка, але без яго непасрэднага ўдзелу. Яна ўключае ў сябе:

-падрыхтоўку да аўдыторных заняткаў (лекцый, практычных, семінарскіх і інш.) і выкананне адпаведных заданняў;

-самастойную працу над асобнымі тэмамі навучальных дысцыплін у адпаведнасці з вучэбна-тэматычнымі планамі;

-напісанне рэфератаў, дакладаў, эсэ;

-выкананне пісьмовых кантрольных і курсавых работ;

- падрыхтоўку да ўсіх відаў кантрольных выпрабаванняў, у тым ліку да залікаў;

-удзел у навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, семінарах, кангрэсах і т.п.

Выкананне любога віду самастойнай работы прадугледжвае праходжанне студэнтамі наступных этапаў:

-вызначэнне мэты самастойнай работы;

- канкрэтызацыя пазнавальнай (праблемнай або практычнай) задачы;

-самаацэнка гатоўнасці да самастойнай працы па рашэнні пастаўленай задачы;

-выбар адэкватнага спосабу дзеянняў, які вядзе да вырашэння задачы (выбар шляхоў і сродкаў для яе рашэння);

-планаванне (самастойна ці з дапамогай выкладчыка) самастойнай работы па рашэнні задачы;

-рэалізацыя праграмы выканання самастойнай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Метадычныя парады і рэкамендацыі да заданняў

Усе тыпы заданняў, што выконваюцца студэнтамі, у тым ліку ў працэсе самастойнай работы, так ці інакш утрымліваюць устаноўку на набыццё і замацаванне Дзяржаўным адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі аб'ёму ведаў, а таксама на фарміраванне ў рамках гэтых ведаў некаторых навыкаў разумовых аперацый – уменне ацэньваць, аналізаваць, параўноўваць, каментаваць і г.д. Некаторыя заданні патрабуюць тлумачэння:

1. Пракаментаваць выказванне - растлумачыць, якая ідэя пакладзена ва ўрыўку, аб якой пазіцыі яе аўтара яна сведчыць.

2. Параўнаць - выявіць падабенства і адрозненне пазіцый па пэўных прыкметах.

3. Абгрунтаваць адзін з некалькіх прапанаваных варыянтаў адказу - прывесці аргументы на карысць правільнасці выбранага варыянту адказу і паказаць, у чым памылковасць іншых варыянтаў.

4. Аргументаваць (абгрунтаваць, даказаць, растлумачыць) адказ.

5. Правесці аналіз – раскласці вывучаемыя з'явы на складовыя часткі, супаставіць іх з мэтай выяўлення ў іх істотнага і неабходнага.

6. Тэзісна выкласці ідэю, канцэпцыю, тэорыю – з выкарыстаннем матэрыялу вучэбных дапаможнікаў і іншай літаратуры, коратка, але не ў шкоду зместу сфармуляваць асноўныя палажэнні вучэння.

7. Адлюстраваць схематычна - значыць раскрыць змест адказу ў выглядзе табліцы, малюнка, дыяграмы і іншых графічных формаў.

Важным складнікам самастойнай пазааўдыторнай падрыхтоўкі з'яўляецца праца з літаратурай па ўсіх відах заняткаў: семінарскіх, практычных, пры падрыхтоўцы да залікаў, экзаменаў, тэсціравання, удзелу ў навуковых канферэнцыях.

Уменне працаваць з літаратурай азначае навучыцца асэнсавана карыстацца крыніцамі. Перш чым прыступіць да засваення навуковай літаратуры, рэкамендуецца чытанне падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.

Вывучэнне навуковай, вучэбнай і іншай літаратуры патрабуе вядзення працоўных запісаў.

Форма запісаў можа быць вельмі разнастайнай: просты або разгорнуты план, тэзісы, цытаты, канспект. Студэнтам рэкамендуецца самастойна выконваць даклады, індывідуальныя пісьмовыя заданні і практыкаванні, прапанаваныя пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў. Праца, звязаная з рашэннем гэтых задач і практыкаванняў, уяўляе сабой від інтэлектуальнай практычнай дзейнасці. Яна спрыяе выпрацоўцы ўмення і звычкі рабіць што-небудзь правільна, а таксама замацаванню навыкаў і ведаў па праблеме.

*Метадычныя рэкамендацыі па напісанні пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў*

Напісанне пісьмовых навукова-даследчых работ студэнтаў вырашае шэраг задач:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-навучанне студэнтаў самастойнаму пошуку і адбору вучэбнай і спецыяльнай навуковай літаратуры па прадмеце;

-прывіццё навыкаў рэферыравання навуковых артыкулаў па праблематыцы вывучаемых дысцыплін;

-выпрацоўка ўменняў падрыхтоўкі рэфератаў, дакладаў, выступаў і паведамленняў;

-набыццё вопыту выступленняў з дакладамі на семінарскіх занятках;

-сістэматызацыя, замацаванне і пашырэнне тэарэтычных і практычных ведаў і навыкаў па вывучаемых дысцыплінах;

- далучэнне студэнтаў да вырашэння праблемных пытанняў па абранай тэме работы;

-навучанне студэнтаў выкладаць матэрыял у выглядзе стройнай сістэмы тэарэтычных палажэнняў, звязаных лагічнай паслядоўнасцю і падмацаваных прыкладамі з практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для кантролю якасці адукацыі выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

- ацэнка рашэння тыпавых заданняў;
- крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты па асобных раздзелах дысцыпліны і дысцыпліне ў цэлым;
- вуснае апытанне падчас заняткаў;
- ацэнка рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны з выкарыстаннем манаграфічнай і перыядычнай літаратуры;
- залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНЬВАННЯ АДУКАЦЫЙНЫХ ВЫНІКАЎ СТУДЭНТАЎ

| | **Крытэрыі ацэнкі** |
|---|---|
| **не залічана** | Адмова ад адказу, поўная адсутнасць прафесійных кампетэнцый, фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту; веданне асобных фактаў з літаратурных крыніц, якія рэкамендаваны праграмай дысцыпліны, няздольнасць выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію, пасіўнасць на семінарскіх занятках. Адсутнасць поўнага аб’ёму ведаў у межах адукацыйнага стандарту; веданне часткі асноўнай літаратуры, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай; значныя лінгвістычныя і лагічныя памылкі ў выкарыстанні навуковай тэрміналогіі; няздольнасць арыентавацца ў асноўных тэорыях і канцэпцыях дысцыпліны. |
| **залічана** | Дастатковы аб’ём ведаў у межах агульнаадукацыйнай стандарту; засваенне асноўнай літаратуры, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай; уменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію і рабіць высновы без істотных памылак; здольнасць арыентавацца ў асноўных тэорыях і канцэпцыях прадмета і даваць ім ацэнку; праца на семінарскіх занятках пад кіраўніцтвам выкладчыка; уменне карыстацца навуковай тэрміналогіяй, здольнасць рабіць высновы; валоданне асноўнымі тэорыямі дысцыпліны; засваенне асноўнай літаратуры, якая рэкамендавана навуковай праграмай, неістотныя памылкі пры выкананні навучальных і прафесійных задач. Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах і тэмах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; лагічна вытрыманыя адказы, здольнасць рабіць абгрунтаваныя высновы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры праграмы дысцыпліны; здольнасць арыентавацца ў асноўных тэорыях і даваць ім крытычную ацэнку; самастойная і актыўная праца на семінарскіх занятках; ўдзел у групавых абмеркаваннях; валоданне метадамі комплекснага аналізу і здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай праграмы, уменне самастойна выяўляць і выкарыстоўваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі вучэбнай дысцыпліны; пошукавая творчая дзейнасць па вырашэнні актуальных праблем дысцыпліны. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка »

ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА

«__» _________ 2014 г. г. Мінск №__

пасяджэння кафедры гісторыі Беларусі

Старшыня – М.М. Забаўскі
Сакратар – Н.А. Гурыновіч
Прысутнічалі: Барабаш Н.В., Вялікі А.Ф., Забаўскі Н.М., Жмуроўскі С.Д., Канапацкая З.І., Лютая А.Э., Пракапович Л.Э., Рацько А.Ф., Шкуцько Л.Л.

Парадак дня:
СЛУХАЛІ:

Аб рэкамендацыі да зацвярджэння вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне: «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» для спецыяльнасцяў профілю А-педагогіка.

ВЫСТУПІЛІ:

Загадчык кафедры, прафесар Люты А.М. прапанаваў рэкамендаваць да зацвярджэння вучэбную праграму ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне: «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» для спецыяльнасцяў профілю А-педагогіка.

ВЫРАШЫЛІ:

Рэкамендаваць да зацвярджэння вучэбную праграму ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне: «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» для спецыяльнасцяў профілю А-педагогіка.

Загадчык кафедры А.М.Люты

Сакратар Н.А.Гурыновіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка »

ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА

«___» _________ 2014 г. г. Мінск №___

пасяджэння савета гістарычнага факультэта

Старшыня – М.М. Забаўскі
Сакратар – І.І. Сержановіч
Прысутнічалі: Багдановіч І.І., Варывончык І.В., Жытко А.П., Корзюк А.А., Люты А.М., Тугай У.В., Мініцкі М.І., Фамін В.М., Чыкалава І.Р.

Парадак дня:
СЛУХАЛІ:
Аб рэкамендацыі да зацвярджэння вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне: «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» для спецыяльнасцяў профілю А-педагогіка.

ВЫСТУПІЛІ:
Загадчык кафедры, прафесар Люты А.М. прапанаваў рэкамендаваць да зацвярджэння вучэбную праграму ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне: «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» для спецыяльнасцяў профілю А-педагогіка.

ВЫРАШЫЛІ:
Рэкамендаваць да зацвярджэння вучэбную праграму ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне: «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» для спецыяльнасцяў профілю А-педагогіка.

Старшыня М.М.Забаўскі

Сакратар І.І.Сержановіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**РЭЦЭНЗІЯ**

**на вучэбную праграму «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» для ВНУ, падрыхтаваную кафедрай гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"**

Прадстаўленая на рэцэнзію вучэбная праграма «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» для спецыяльнасцей профілю А – педагогіка аформлена ў адпаведнасці з нарматыўнымі патрабаваннямі. Дакладна пастаўлены мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны, вызначаны камтетэнцыі, якімі павінен авалодаць студэнт. Абгрунтавана актуальнасць вывучэння дысцыпліны.

У змест праграмы ўключаны раздзелы, якія паслядоўна раскрываюць асноўныя этапы станаўлення і развіцця грамадскай думкі Беларусі: "Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці. Уплыў хрысіянства на генезіс грамадска-палітычнай думкі старажытнай Беларусі", "Грамадска-палітычная думка ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі", "Палітычная і прававая думка ў перыяд Контррэфармацыі і панавання клерыкальнай ідэалогіі", "Асветніцкія ідэі і іх уплыў на грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі", "Грамадска-палітычная думка ў першай палове XIX ст.", "Актывізацыя грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі ў другой палове XIX-пачатку XX стст.", "Беларускі нацыянальны рух у перыяд абвяшчэння і стварэння беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.)", "Грамадска-палітычная думка ў Беларусі ў 1920–1930-я гг.", "Асаблівасці грамадскага жыцця ў пасляваенны перыяд. (1945 – 1990 гг.)", "Грамадска-палітычнае развіццё Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Станаўленне новых духоўных каштоўнасцей ў грамадстве".

Асноўныя палажэнні праграмы адлюстроўваюць працэсы станаўлення і развіцця грамадскай думкі ў Беларусі праз прызму нацыянальнай культуры, этнічнай і рэлігійнай свядомасці народа.

Праграма накіравана на вывучэнне ў храналагічнай паслядоўнасці адносіны розных груп людзей, пэўных асоб да падзей і фактаў сацыяльнага жыцця. У цэнтры ўвагі стан массавай свядомасці, які адлюстроўвае погляды

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

грамадства або яго часткі на з’явы і працэссы сацыяльна-палітычнай і сацыяльна-культурнай рэчаіснасці.

Вывучэнне дадзенай дысцыпліны дапаможа ўнесці ўклад у фарміраванне патрыятычнага светапогляду студэнтаў. Праз раскрыццё зместу праграмы магчыма азнаёміцца з жыццём і дзейнасцю, духоўнай спадчынай выдатных дзеячаў гісторыі, навукі, культуры, палітыкі Беларусі.

Рэцэнзент –
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт, дацэнт кафедры тэорыі
і гісторыі дзяржавы
і права Акадэміі кіравання
пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь А.А. Цобкала

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**РЭЦЭНЗІЯ**

**на вучэбную праграму «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» для спецыяльнасцей профіля А – педагогіка**

Прадстаўленая на рэцэнзію вучэбная праграма «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» для спецыяльнасцей профіля А – педагогіка адпавядае патрабаванням сучаснага ўзроўню развіцця ведаў аб гісторыі грамадскай думкі. Праграма складаецца з тлумачальнай запісцы, тэматычнага плана, праграмнага зместу, спісу асноўнай і дадатковай літаратуры, грунтоўных метадычных рэкамендацый па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў.

Актуальнасць вывучэння дысцыпліны абумоўлена неабходнасцю выпрацоўкі ў студэнтаў навуковага погляду на гісторыю грамадскай думкі, якая развівалася ў працэссе ўзаемадзеяння разнастайных сацыяльна-эканамічных, этнакультурных, геапалітычных і культурна-цывілізацыйных фактараў.

Вывучэнне дысцыпліны дазволіць вызначыць генэзіс беларускай грамадскай думкі ў цеснай сувязі з гісторыяй нацыянальнай культуры і фарміраваннем этнічнага аблічча беларускага народа на агульнаеўрапейскім фоне; прасачыць канфесійны, сацыяльны, палітычны склад удзельнікаў грамадска-палітычнага руху на розных гістарычных этапах.

Праграма складзена на аснове прынцыпаў гістарызму, аб’ектыўнасці і каштоўнаснага падыходу, па храналагічна-праблемнай методыцы. Такім чынам праграма ўлічвае фарміраванне грамадскай думкі Беларусі на працягу стагодзяў. Навукова-метадычны змест і структура праграмы адлюстроўвае спецыфіку працэса атрымання адукацыі ў вышэйшай школе.

Вывучэнне спецкурса павінна садзейнічаць фарміраванню ў студэнтаў асабістых сацыяльна-значымых кампетэнцый: кампетэнцыі культурна-каштоўнаснай і асабістай арыентацыі; кампетэнцыі патрыятызму і грамадзянскай адказнасці; кампетэнцыі сацыяльнага ўзаемадзеяння; кампетэнцыі самаўдасканалення. Фарміраванне ў студэнтаў сацыяльна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

каштоўнасных кампетэнцый павінна ажыццяўляцца паралельна з развіццём прафесійнай кампетэнцыі як інтэгранаванага выніка адукацыі ва ўніверсітэце.

Рэцэнзуемая праграма распрацавана на высокім навукова-метадычным узроўні і можа быць рэкамендавана ў якасці базавай для спецыяльнасці профіля А – педагогіка.

Рэцэнзент –
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры славянскай гісторыі
і метадалогіі гістарычнай навукі С.А. Талмачова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ